Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Барановичский государственный университет»
Студенческое научное общество БарГУ

# СОДРУЖЕСТВО НАУК. БАРАНОВИЧИ-2016

Материалы XII Международной
научно-практической конференции
молодых исследователей

(Барановичи, 19—20 мая 2016 года)

В трёх частях

Часть 1

Барановичи
БарГУ
2016

Репозиторий БарГУ

УДК 001(082)

В часть 1 сборника материалов XII Международной научно-практической конференции молодых исследователей «Содружество наук. Барановичи-2016» включены материалы докладов по актуальным проблемам различных научных направлений: филологические науки (русский, белорусский языки); лингвистика (английский, немецкий языки); методика преподавания иностранного языка, правоведение.

Сборник адресован преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, В. Н. Кременевская (отв. секретари),
О. Н. Фенчук, Т. М. Пучинская, А. А. Савко, Н. А. Егорова, М. В. Андрияшко

Рецензент

кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой германских языков факультета
международных отношений Белорусского государственного университета М. Ф. Арсентьева

Репозиторий БарГУ

**ISBN 978-985-498-735-4 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-498-734-7**
© БарГУ, 2016

Однако писатель никогда не довольствовался одними лишь доводами рассудка. Он хотел, чтобы его читатель не просто наблюдал за героями романа со стороны и размышлял об их судьбе, а пережил бы её, мысленно поставив себя на их место. Как писатель-моралист, стремившийся воздействовать на сознание читателя, он не ограничивался описанием воспоминаний дорогих для его героев, а хотел, чтобы они возникли у самого читателя, и приёмы, используемые им с этой целью, имеют много общего с теми методами, на которые ссылаются специалисты по гипнозу. Как установили учёные, внушение достигается повторением, и во всех шести десятках предложений из «Братьев Карамазовых» ровно шестьдесят раз повторяются слова, непосредственно связанные с памятью, её ясностью и непреходящей ценностью.

Характеры главных героев романа, их взаимоотношения и идеи в романе помогают раскрыть множество проблем. В первую очередь проблемы нравственности, проблему выбора и идейных принципов, проблему человеческих взаимоотношений и проблемы сострадания и прощения. И, несмотря на то, что эти проблемы широки и многогранны, Ф. М. Достоевский смог, как нам кажется, в своём монументальном труде осветить их. Центральная для философии и творчества Ф. М. Достоевского проблема добра и зла нашла свой собственный смысл и своё решение.

**Заключение.** Тема воспоминаний, добра и зла представлялась Ф. М. Достоевскому исполненной глубокого жизненного смысла и не только играла ключевую роль в его творчестве, но и служила инструментом, позволявшим пробудить у читателя определённые мысли и чувства.

**Список цитируемых источников**

1. Достоевский Ф. М. Братья Карамазовы : роман. М. : АСТ : АСТ Москва : Хранитель, 2007. 781 с.
2. Там же. С. 17.
3. Там же. С. 141.
4. Там же. С. 744.
5. Там же. С. 17.

УДК 882.6.09(091)(075.8)

**І. С. Мялік**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## БОТЫ ЯК АНТАЛАГІЧНАЯ ДЭТАЛЬ У ТВОРАХ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ

**Уводзіны.** Рэчыўны свет мае вялікае значэнне для ўсяго мастацтва слова ў цэлым. Мастацкі прадмет часта адыгрывае значную ролю ў сюжэце твора. Рэчавая дэталь дапамагае пранікнуць у сутнасць з'явы, характару, у сэнс чалавечага існавання. Даследчык В. Халізеў заўважае: «Літаратура ХХ стагоддзя адзначылася небывала шырокім выкарыстаннем вобразаў навакольнага свету не толькі як атрыбутаў побыту, асяроддзя пражывання людзей, але і перш за ўсё як прадметаў, што арганічна зрасліся з унутраным жыццём чалавека» [1, с. 205].

**Асноўная частка.** Сукупнасць рэчаў складае рэчавы свет, таму, кажучы пра рэчы ў літаратурным творы, мы звяртаемся да ўсёй сукупнасці створаных чалавекам прадметаў, якія ўваходзяць у мастацкі свет твора. Чым далей, тым больш чалавек жыве не ў асяроддзі прыроды, а ў асяроддзі створаных ім самім прадметаў. Натуральна, што свет рэчаў адбіваецца і ў літаратуры, прычым з цягам часу набывае ўсё большую значнасць. Аўтар У. М. Тапароў адзначае: «Зразумела, асноўны статус рэчы невысокі: рэч заўсёды другасная, дапаможная, несамадастатковая. Выраблена чалавекам з чагосьці першаснага (ці «больш першаснага», чым сама), яна прызначана для задавальнення нейкіх патрэбаў, для выкарыстання яе чалавекам» [2, с. 71]. Так, рэч стаіць паміж чалавекам і вынікам, якога ён спадзяецца дасягнуць з яе дапамогай, каб задаволіць свае патрэбы. Рэч наўпрост звязана з паводзінамі, свядомасцю людзей і складае неабходны кампанент культуры: «рэч перарастае сваю «прадметнасць» і пачынае жыць, дзейнічаць, «як рэч» у духоўнай прасторы» [3]. Чалавек пазнаецца праз прадмет, які яму належыць, праз разуменне таго, якое значэнне ў жыцці чалавека мае той ці іншы прадмет. У дадзеным артыкуле мы звярнуліся да апавяданняў В. Дубатоўкі «Боты» і А. Якімовіча «Апоркі», якія даюць уяўленне пра складанасці жыцця ў Заходняй Беларусі.

Такая рэч, як боты, бясспрэчна, заслугоўвае заняць месца ў беларускім нацыянальным Лірычным музеі (М. Эпштэйн). «Карычневыя, прыгожа прашытыя тонкімі скуранымі ніткамі боты пераліваліся і пабліскваді» [4, с. 7]. Яны з'яўляюцца «генам сюжэта» і «загаловачным героем» аднайменнага апавядання нашага сучасніка В. Дубатоўкі. Спраўныя боты, пашытыя местачковым шаўцом Ёселем, лепшыя, чым у самога князя Сапегі. Гаспадар — былы парабак Мікола Шпак, нейкі час «амерыканец», а зараз гаспадар-хутаранец — цэлы год працаваў на іх: «дубовыя цвічкі, слаёная цвёрдая падэшва, дый скура якая!» [5]. Валодаючы такім скарбам, галоўны герой вельмі задаволены і поўны гонару. Але гэты скарб засмучае жонку Шпака. І сапраўды, як прадчувала жонка, боты прыносяць уладальніку шмат нягод. Неспакойны час, барацьба за ўладу, увядзенне новых парадкаў мяняюць лёсы людзей. Спачатку боты ўпалі на вока

© Мялік І. С., 2016



Репозиторий БарГУ

завадатару мошкаўскіх бандытаў Сцяпану Кулаку. Гэта было на Вялікдзень, а ўвосень (гэта было ў 1939 г.) прайшла чутка, што ідуць «Саветы». Банда Кулака скарысталася часовым безуладдзем і гойсала па вёсках за спажывай. Шпакі схавалі лепшае, што мелі, у паграбе, а боты Мікола закапаў пад сабачай будай. Новая ўлада прызначыла Кулака старшынёй сельсавета, і ён неўзабаве з’явіўся да Міколы па грошы, золата і боты. Тут ён праявіў сваю жорсткасць, забыўшыся на тое, што разам вучыліся, збіў Шпака і загадаў паведаміць, калі раптам на хутары з’явіцца Альбін Клімашэўскі, які раней працаваў на дэфензіву і быў ворагам Кулака. Калі Кулак зноў прыехаў па боты, Мікола зманіў яму, што перад самым адыходам палякаў іх забраў Клімашэўскі. Ішоў час, Мікола мусіў уступіць у калгас, каб з сям’ёй не паехаць «да белых мядзведзяў». Пачалася вайна. Прыйшлі немцы на хутар, а з імі Клімашэўскі, які таксама не забыўся пра боты. Але Шпак сказаў яму, што ў ботах уцёк ад немцаў Кулак. На доўгі час жыццё гаспадара хутараператварылася ў пекла: днём — паліцаі з Клімашэўскім, уночы — партызаны з Кулаком. Мікола горка жартаваў: «От, скажы ты! Ужо год мінула, як яны па чарзе сюды ездзяць і ўсё пра боты пытаюцца. Каб сказаць Ёселю, што яго боты так цэняцца. Ды, пэўна, загінуў Ёсель, калі за мястэчкам габрэяў пастралялі» [6]. Скончылася нарэшце вайна. Былы паліцай Альбін Клімашэўскі арганізаваў у лесе вялікую банду, якую лавіў Сцяпан Кулак: яго накіравалі ў родныя мясціны змагацца з байцамі «Арміі краёвай». У адзін з перадвелікодных дзён з-пад будкі застрэленага паліцаямі сабакі Мікола дастаў скрутак. Боты, шчодра вымазаныя дзёгцем, былі ў выдатным стане. Рыхтуючыся да ўсяночнай, Мікола абуўся ў іх насуперак жончыным угаворам не рабіць гэтага, лепш прадаць боты пасля святаў на слонімскім кірмашы. У мястэчку Шпак даведаўся, што людзі Кулака пабілі банду, але Клімашэўскага не злавілі, і што Кулак раз’юшаны. Да таго ж адзін з былых партызанаў Кулака ўбачыў на Міколавых нагах боты і выкрыў яго колішні падман. Устрывожаны Шпак заспяшаўся дадому. У хаце ён убачыў Клімашэўскага, а той — боты на ягоных нагах, што прывяло бандыта ў шаленства. З’явіўся ў той дзень на хутары і Кулак. Мікола, намацаўшы тронак вілаў, кінуўся на свайго ворага. Яшчэ некалькі хвілін — і ўсё было скончана. Але Мікола не адчуваў радасці перамогі. Ён «глядзеў не адрываючыся ў зямлю і ні пра што ўжо не думаў» [7]. Боты, як і хутар, — знак бяды для чалавека, які імкнецца самаажыццявіцца як гаспадар у неспрыяльным для гэтага сацыяльна-палітычным кантэксце. Мікола — гэта заходнебеларускі Пятрок, які мусіў зразумець, што ні з тымі, ні з іншымі па-людску нельга... Як напісаў В. Шалкевіч, калі ў жыцці чалавека пачуцці саступаюць месца іншым пачуццям, сябры і знаёмыя сыходзяць, прыходзяць і зноў сыходзяць, то «...толькі рэчы застаюцца там жа і нязменнымі...» [8, с. 6]. Гэта своеасаблівае рэзюмэ да апавядання В. Дубатоўкі «Боты», дзе застаецца толькі дадаць, што мяняюцца месцамі героі і ліхадзеі, а рэчы застаюцца там жа і нязменнымі.

Літаратура XX ст. узбагаціла мастацка-выяўленчы дыяпазон вобразаў прадметна-рэчыўнага свету не толькі як матэрыяльных атрыбутаў чалавечага асяроддзя і існавання, але перш за ўсё як прадметаў, што арганічна з’ядналіся з унутраным жыццём чалавека і рэпрэзентуюць разнастайныя сімвалічныя значэнні. Ва ўмовах краху звыклай рэчаіснасці пераасэнсоўваюцца і асобныя анталагічныя дэталі. Асабліва гэта датычыць прадметаў адзення, пра што сведчыць і апавяданне А. Якімовіча «Апоркі». У ім таксама паказаны цяжкі лёс беларускага селяніна пад уладай палякаў. Сям’я Лаўрэна нічога свайго не мела, працавала за кусок хлеба. Таму бацька імкнуўся даць адукацыю свайму сыну. Але становішча пагаршалася, нават абутку не стала ў Міхаські, каб ён пайшоў у школу. «Нарэшце, выхад быў знойдзены. Канешне, Міхаська павінен вучыцца. Аб гэтым даўно перадумана і перагаворана ў сям’і. А сёння ён пойдзе ў школу ў бацькавых апорках!» [9, с. 100]. Задача маці — забіраць апоркі, каб бацька мог пайсці на работу. «Апоркі, аб якіх ішла размова, былі бязлітасна разбітыя і зношаныя. Але бацька шанаваў іх і клапаціўся аб іх не менш, чым аб хлебе» [10]. Прыйшоўшы ў школу, Міхаська зняў апоркі і прасіў, каб матуля не спазнілася прынесці яму гэты сціплы абутак. Калі маці сышла, вучні пачалі смяяцца з Міхаські: «Басяк! Басяк!» [11]. Ніхто нават не пацікавіўся, чаму Міхаська босы. Так прайшоў вучэбны дзень. Міхаська вельмі чакаў матулю. «Дзе ж маці? Чаму не нясе яна апоркаў?» [12]. Міхаська не меў іншага выйсця, як ісці дадому. Спачатку ён нібы не адчуваў холаду, але пасля пачаў губляць сілы. «Яшчэ хоць чутачку адпачыць бы. Вочы самі зліпаюцца, іх немагчыма разняць. Ды навошта? Куды спяшацца? У школу? Не, ён болей туды не пойдзе…» [13]. Боты (апоркі) як яркая мастацкая дэталь выяўляюць трагізм існавання простага чалавека. Менавіта гэтая рэч «падказвае» развіццё сюжэту і стымулюе яго дынаміку. Боты як сімвал сялянскага дабрабыту і заможнасці рабіліся прычынай няшчасцяў.

**Заключэнне.** Мастацкі свет літаратуры багаты і матэрыяльна насычаны. Канкрэтыка і паэтыка рэчы знайшлі яскравае мастацкае ўвасабленне ў літаратурных творах крызісных перыядаў XX ст.. Паказаныя ў складзе інтэр’ера ці па-за яго межамі рэчы выяўляюць шырокі дыяпазон змястоўных функцый, набываюць надзвычай адказную ролю ў паказе духоўнага жыцця асобы. Як сцвярджае А. П. Чудакоў, «кожны мастак гаворыць на рэчавай «мове» сваёй эпохі» [14, с. 47]. Можна адзначыць, што ў сацыяльных катаклізмах і трагедыях XX ст. вобразы рэчаў набываюць надзвычай важную і адказную ролю. Тая ці іншая рэч сваёй прысутнасцю побач з героем ужо пэўным чынам уздзейнічае на яго свядомасць, учынкі, паводзіны.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Хализев В. Е. Теория литературы : учеб. для вузов. 2-е изд. М. : Высш. шк., 2000. 398 с.
2. Топоров В. Н. Вещь в антропоцентрической перспективе. М., 1993. 325 с.
3. Вещь [Электронный ресурс]. URL: http://capta.ru/book (дата обращения: 28. 10. 2015).
4. Дубатоўка В. Чорная Воля. Гародня : Гарадз. б-ка, 2013. 149 с.
5. Там жа. С. 8.
6. Там жа. С. 41.
7. Там жа. С. 46.
8. Шалкевіч В. Requiem па непатрэбных рэчах. Гародня : Гарадз. б-ка, 2011. 98 с.




Рэпазіторый БарДУ

9. Якімовіч А. Выбраныя творы : у 2 т. Мн. : Беларусь, 1967. Т. 1. 389 с.
10. Там жа. С. 100.
11. Там жа. С. 101.
12. Там жа. С. 103.
13. Там жа. С. 104.
14. Чудаков А. П. Предметный мир литературы: к проблеме категории исторической поэтики // Истор. поэтика: итоги и перспективы изучения. М., 1986. 254 с.

УДК 811.161.3(043.3)

**В. С. Нічыпарук**
*Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», Брэст*

## НАЗВЫ ГАТУНКАЎ ХЛЕБА: ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

**Уводзіны.** Хлеб — найбольш сакралізаваны від ежы, сімвал дабрабыту, шчасця, дастатку. *Хлеб у доме — гаспадар, на працы — сябра, у дарозе — таварыш; без хлеба далёка не зойдзеш* — так гаварылі пра яго беларусы. Хлеб цяпер успрымаецца занадта простым, каб мець сімвалічнае значэнне. Але гэтая прастасць уяўная. За ёй стаяць дасканаласць і грунтоўнасць. Галоўнае, з чым атаясамліваецца хлеб, — глыбокая ўкарэненасць у роднай зямлі. Хлеб стаў звычайным, аднак і сёння для большасці з нас падсвядома застаецца прадуктам сакральным. З цягам часу выпяканне хлеба з дробных прыватных пякарняў (часта сямейных) было перанесена ў буйныя прамысловыя прадпрыемствы. Перад імі зараз стаіць мэта задавальнення патрэбаў вялікай колькасці людзей цаной мінімальных выдаткаў. З гэтай прычыны тэхналагічныя працэсы на прадпрыемствах адрозніваюцца ад традыцыйнага падыходу, які людзі выкарыстоўвалі сотнямі гадоў. У выніку прамысловасць вырабляе проста матэрыяльны аб’ект, які не ўвасабляе пэўнай ідэі. Сімвальнасць, сакралізаванасць хлеба, магчыма, сёння пекары свядома ці падсвядома перадаюць у назвах гатункаў хлеба.

Мэта нашага даследавання — сабраць і класіфікаваць беларускамоўныя назвы гатункаў хлеба, правесці лінгвакультуралагічны аналіз сабранага матэрыялу. Для гэтага намі складзена картатэка назваў гатункаў хлеба, асэнсаваны тэарэтычны матэрыял пра хлеб і яго функцыі ў культуры і традыцыях беларусаў. Для дасягнення мэты і вырашэння задач даследавання выкарыстоўваліся этымалагічны, кампанентны і семантыка-стылістычны метады.

**Асноўная частка.** Сабраны матэрыял дае падставы выдзеліць наступныя групы назваў хлеба паводле матывавальнай асновы: 1) назвы паводле месца вытворчасці; 2) назвы — якасныя характарыстыкі хлеба; 3) назвы паводле прадуктаў, з якіх зроблены хлеб; 4) адапелятыўныя назвы; 5) адайканімічныя назвы (імя).

Назвы паводле месца вытворчасці: «Налібокскі», «Траецкі», «Гародня».

Назва хлеба *«Гародня»* суадносіцца з горадам Гродна і гаворыць пра тое, што хлеб зроблены ў гэтым месце. Гародня — паэтычна-літаратурная назва горада Гродна. Гэта адзін са старажытнейшых гарадоў Беларусі. Ён упершыню згадваецца ў 1128 г. ў Іпацьеўскім летапісе. Магчыма, назва хлеба *«Налібокскі»* паходзіць ад назвы Налібоцкай пушчы. Гэта самы вялікі лясны масіў у Беларусі. Месца ў пэўным сэнсе ўнікальнае. На еўрапейскім кантыненце Налібоцкая пушча захавалася ў адносна некранутым стане і мае статус рэспубліканскага ландшафтнага заказніка. Назва хлеба *«Траецкі»* паходзіць ад назвы Траецкага прадмесця — гістарычнага раёна Мінска на мысе левага берага Свіслачы. Першапачаткова гэты раён з’яўляўся гандлёва-адміністрацыйным цэнтрам старадаўняга Мінска. На тэрыторыі прадмесця быў размешчаны першы каталіцкі храм Мінска. Тут таксама знаходзіліся незахаваныя да нашых дзён Свята-Узнясенскі манастыр з аднайменнай царквой, Свята-Барысаглебская царква, жаночы базыльянскі манастыр Святой Тройцы (захаваўся часткова) і касцёл і манастыр каталіцкага манаскага ордэна марыявітак. Гэтае месца на самой справе можна назваць святым. Хлеб — каштоўны прадукт для нас, такім ён быў і для нашых продкаў, таму дарэчным з’яўляецца суаднясенне назвы *«Траецкі»* з такім выдатным месцам, як Траецкае прадмесце.

Назвы — якасныя характарыстыкі хлеба: «*Сапраўдны», «Смачны гасцінец», «Духмяны», «Шчодры», «Спадар шчодры»*.

Назва хлеба *«Сапраўдны»* падказвае, што менавіта гэты хлеб прыгатаваны без кансервантаў, па ўсіх правілах і з’яўляецца добрым прадуктам для спажывання ў якасці ежы (прыметнік *сапраўдны* ‘які адпавядае нашым уяўленням пра што-небудзь; аўтэнтычны, праўдзівы, не фальшывы’). Прыметнік «*духмяны*» ‘з моцным прыемным пахам; пахучы’ выклікае асацыяцыі свежавыпечанага хлеба з адпаведнай назвай «*Духмяны*». Трэба ўспомніць той час, калі хлеб пяклі ў печах, часта на кляновых лістах, ён быў смачны і духмяны (Мінскі хлебазавод выпякаў хлеб на кляновых лістах і ў наш час). Назва *«Зорка гандлю»* таксама гаворыць пра высокую якасць хлеба і вялікі попыт на гэтую прадукцыю. Пра якасць гатунку «*Смачны гасцінец*» гавораць абодва словы. У адным са значэнняў гасцінец — гэта рэч, ласунак, якія госць або блізкі падносіць каму-небудзь як падарунак. Хлеб таксама можа быць добрым і смачным гасцінцам. Да нашага часу захавалася традыцыя ісці першы раз у госці з хлебам ці пячэннем, булкай, тортам, бо *без солі, без хлеба — не тая бяседа*. Лексема ‘смачны’ скіроўвае пакупніка на прыемны смак,

© Нічыпарук В. С., 2016



Рэпазіторый БарГУ